**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўны**
**«Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі**
**(канец XVIII ст. – 1850-я гг.)»,**

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09–гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Тэма дысертацыі Надзеі Канстанцінаўны Сямашка «Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)» з'яўляецца надзвычай актуальнай для паглыблення тэарэтычных і канкрэтна-гістарычных ведаў пра развіцце, ускладненне і ўзаемадзеянне навуковых канцэпцый, прысвечаных крызісу прыгоннага ладу і зараджэнню элементаў капіталізму ў беларускай весцы. Саіскальнік акцэнтуе ўвагу на адсутнасць абагульняючых даследаванняў, якія б аналізавалі працы беларускіх і расійскіх навукоўцаў па пытаннях перадрэформеннай аграрнай гісторый Беларусі, выдадзеных ад пачатку вывучэння праблемы да сучаснага стану яе распрацоўкі.

У аўтарэфераце саіскальнік даў падрабязную і пераканаўчую характарыстуку праблемнаму полю даследавання, лагічна абгрунтаваў абраныя храналагічныя межы і структуру дысертацыі. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарастанных крыніц і даткаў. Змест дысертацыі прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання, – адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.

Структура аўтурэфэрата лагічна, матэрыял выкладзены паслядоўна, тэма дысертацыі раскрыта належным чынам. Неабходна аддаць належнае лагічнаму фармуляванню даследчых задач і іх паслядоўнаму і абгрунтаванаму вырашэнню ў палажэннях на абарону і высновах даследавання. Саіскальнікам выкарыстаны шырокі набор метадаў для вывучэння праблемы, пераканаўча паказана канцэптуальная ідэя дысертацыі.

Навуковая навізна дысертацыйнай работы заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзены грунтоўны, сістэмны і ўсебаковы аналіз публікацый даследчыкаў дарэвалюцыйнага перыяду, устаноўлены іх этнаграфічная накіраванасць, апісальнасць падзей і працэсаў. Скіраванасць на рэфлексіўнае тлумачэнне палітычных мерапрыемстваў царскай улады. Выяўлены асноўныя напрамкі і прыярытэты ў даследаваннях савецкага часу пры абсалютызацыі марксісцка-ленінскай метадалогіі з яе галоўнай мэтай абгрунтавання непазбежнасці крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і заканамернага скасавання прыгоннага ладу.

У дысертацыі ўпершыню ў гістарычнай навуцы ў праблемна-храналагічным плане праведзены аналіз сучаснага стану айчыннай гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. Нягледзячы на дэідэалагізацыю гістарычнай навукі пасля распаду СССР, гісторыкі сучаснага перыяду ў недастатковай ступені пераасэнсоўваюць

атрыманыя вынікі даследаванняў савецкага часу. Сучасныя даследчыкі на падставе рэалізацыі мадэрніcцкай тэорыі гісторыі прыйшлі да высновы аб перабольшванні тэмпаў развіцця генезісу капіталізму ў беларускай вёсцы, ролі класавай барацьбы як вызначальнага фактару пераходу ад феадалізму да буржуазнага грамадства.

Можна адзначыць, што згодна аўтарэферату, Н. К. Сямашка прытрымлівалася адпаведных патрабаванняў ВАК да апублікаванасці вынікаў дысертацыйнага даследавання і прадстаўленні іх на навуковых канферэнцыях. Вынікі навуковага даследавання адлюстраваны ў 16-ці публікацыях агульным аб'ёмам 4,4 (аўт. л.), з якіх 6 у часопісах, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (2,3 аўт. л.), а таксама прайшлі апрабацыю на навуковых канферэнцыях.

Аўтарэферат напісаны навуковай яснай, зразумелай мовай і характарызуе дысертацыйнае даследаванне як арыгінальную, якасную і самастойную даследчую працу, вынікі якой уяўляюць цікавасць для навукі і могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац і падручнікаў, распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, а таксама эканамічнай гісторыі Беларусі.

Аўтарэферат не утрымлівае прынцыповых недахопаў і адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Змест аўтарэферата сведчыць аб завершанасці навуковага даследавання. Такім чынам, аўтару дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўне можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Вядучы спецыяліст
ДУ «Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь»,
кандыдат гістарычных навук У.Р.Рэут

Максимович М.С. 11.12.2024